Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.



ДУМКА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12 m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Пярамена адрэсу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош, сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту

№ 4 — Вільня, Субота 14-га студзеня 1928 г. — Год I

СЯЛЯНЕ і РАБОТНІКІ! Яшчэ раз напамінаем, што 15-га студзеня апошні дзень паверкі сьпіскау выбіральнікау. Сьпяшайцеся даведацца, ці Вы і Вашы знаёмыя занесены у сьпіскі.

Санацыя або паляваньне?

На выбарную арэну Заходняй Беларусі ў цэлым шэрагу іншых партыяў і груп выступіла і „Сялянская Партыя". Як і ўсе іншыя партыі, зьвяртаецца яна з заклікам да выбіральнікаў: „Усе Беларусы павінны памагаць пры выбарах і галасаваць за свой беларускі сьпісак, каторы шчыра й найлепей бароне інтарэсы беларускага народу. Гэткім сьпіскам будзе той сьпісак, каторы выставе Беларуская Сялянская Партыя... (гл. Народ № 5).

Што гэта за партыя?

Якая яе ідэалёгія?

Да чаго яна імкнецца?

Ці запраўды ёсьць зарука ў тым, што яна „найлепей" будзе бараніць інтарэсы найшырэйшых слаёў беларускіх выбіральнікаў — працоўнага сялянства і работніцтва?

Вось пытаньні, якія мімавольна насоўваюцца ў чытача. На гэтыя пытаньні і лічым нашым абавязкам адказаць хоць у агульных рысах, апрача тае кароценькае нататкі, якая была ў папярэднім нумары нашае газэты. Як ведама, у „Сялянскім Саюзе" здарыўся ў сярэдзіне прошлага году раскол, вынікам якога і зьявілася гэтая „Сялянская Партыя" з яе органам „Народ".

Паходжаньне самой арганізацыі аблягчае нам выкананьне ў агульных рысах пастаўленага намі заданьня. Што такое Сялянскі Саюз? Якая яго ідэалёгія? Гэта ведама кожнаму. Гэткім чынам заданьне наша зводзіцца да наступнага. Нам застаецца толькі адказаць на пытаньне: ці ў асобе Сялянскай Партыі мы маем толькі санаваны (аздароўлены ад дэфэнзыўных элемэнтаў) Сялянскі Саюз, ці яго паляваньне, яго перараджэньне? Або інакш кажучы, якім шляхом хоча весьці беларускае сялянства Сялянская Партыя, якая лічыць сябе прадстаўніком інтарэсаў белар. сялянства, — старым, ці новым шляхам? Перадусім мусіма адзначыць, што тварцы новай Партыі ня выступілі з крытыкай старой праграмы і ідэалёгіі Сялянскага Саюзу. Уся крытыка „Народа" сканцэтравалася пры расколе і пасьля выключна на асобах павадыроў Сель. Саюзу на Ярэмічу, Рагулі і Більдзюкевічу, гэтых запраўдных палітычных бандытах, бяз чэсьці і веры. У сваей прэсе павадыры расколу дамагаліся перадусім ачышчэньня Сялянскага Саюзу ад маральнага раскладу і гнільля. Побач з гэтым зрабілі яны кароценькую заяву, што „сялянскую клясу" яны разумеюць, як „працоўны люд, што сам сабскімі рукамі ўрабляе маці зямлю". Беларуская радыкальная сялянска-работніцкая прэса прывітала гэтую кароценькую заяву, як ідэалёгічны паступ у адносінах да Сель.-Саюзу, як выдзяленьне кулацкіх элемэнтаў з „сялянскае клясы". Аднак, гэта аказалася перадчасным. Навет у праграме Сель. Партыі аб гэтым „выдзяленьні з „сялянскае клясы" кулацкіх элемэнтаў" няма і ўспаміну, а толькі аб „панстве". Навет і на гэткі ідэалёгічны поступ не аказаліся здольнымі правадыры Сялянскай Партыі.

Аб клясавым-жа змаганьні, аб сацыяльным вызваленьні працоўнага сялянства і работніцтва, аб зьнішчэньні эксплёатацыі адных людзей другімі, аб пабудаве новага грамадзкага ладу, аб *неабходнасьці* супольнай барацьбы сялян і работнікаў за гэты лад, аб супольнасьці інтарэсаў працоўных усіх нацыянальнасьцяў, аб неабходнасьці іх супольнай барацьбы, — аб гэтым ані слова ня стрэнем мы ў прэсе Сялянскай Партыі. Наадварот, падзел грамадзянства на клясы, які служыць падставай эксплёатацыі адных людзей другімі, прызнаецца гэтай прэсай нармальным зьявішчам. Аб ухіленьні гэтай падставы эксплёатацыі і нядолі працоўных мас няма ані слова; не аб ухіленьні клясавага грамадзянства, а аб клясавай справядлівасьці ідзе там мова, як быццам само існаваньне кляс, само існаваньне эксплёатацыі адных другімі ня ёсьць найвялікшая несправядлівасьць.

Аб неабходнасьці супольнага змаганьня сялян і работнікаў за новы лад, у якім бы ні было гэтай несправядлівасьці няма дасюль ні слова. Калі Сялянская Партыя ў сваю праграму і ўставіла новыя для сябе словы, што сяляне і работнікі „павінны заўсёды знайсьці супольную мову і суцэльны фронт проці сваіх крыўдзіцеляў", дык пры такіх умовах гэтыя словы трацяць свой зьмест. Яны абяртаюцца ў модную фразу бяз зьместу. Да чаго даходзіць неразуменьне неабходнасьці змаганьня ня толькі за нацыянальнае, але і за сацыяльнае вызваленьне, за новы лад, дзе-бы ня было падзелу на клясы і эксплёатацыі, відаць навет з таго, што пасьпех Грамады тлумачаць бадай выключна яе беларускасьцю. З гэтага мы бачым, што аб паляваньні Сялянскай Партыі няма і мовы.

Сталася толькі замена скампраміταваных правадыроў, або — кажучы таксама модна — санацыя. Шлях застаўся стары.

Вось, што ў сваім часе пісала аб небясьпецы незразуменьня ўсяго вышэйсказанага „Наша Праўда": „Калі новыя сельсаюзьніцкія павадыры ня ўвойдуць на гэты шлях (шлях барацьбы за новы лад — Рэд.) ім — пры ўсіх іх ідэйных імкненьнях — прыдзецца й далей іграць тую паскудную ролю падгалоскаў буржуазіі, якую іграюць ярэмічавы сельсаюзьнікі. А сялянства за імі ня пойдзе, як ня йдзе за Ярэмічам". Трэба сканстатаваць, што на гэты шлях яны не пайшлі і „пры ўсіх іх ідэйных імкненьнях — прыдзецца ім гуляць тую .. ролю падгалоскаў буржуазіі".

Што выйдзе з „польска - літоускіх перагаворау"?..

(Апошнія заявы літоўскага прэм'ера).

Літоўскі ўрад дайшоў у сваей ветлівасьці і карэктнасьці ў „дыплёматычных стасунках" з Польшчай, да таго што — упусьціў у Коўну сьпярша карэспандэнта „Кур. Варш.", а пасьля, праўда, не адразу, — навет карэспандэнта — афіцыяльнага Польскага Тэлеграфнага Агенства...— Але ў гутарцы з гэтым карэспандэнтам прэм'ер Вальдэмарас зрабіў такія заявы, што — ня толькі ў Польшчы ізноў „закіпела"... але, калі верыць францускай прэсе, дык францускі ўрад амаль ня хоча — выслаць да Коўны ўльтыматум, каб у 24 гадзіны Вальдэмарас зрокся прэм'ерства...

Дык трэба ж даць чытачом паслухаць, — што такое сказаў Вальдэмарас у сваей апошняй заяве...

Прыняўшы 7 студзеня карэспандэнта, літоўскі прэм'ер — на запытаньне апошняга — калі спадзяецца ён распачаць перагаворы з польскім урадам — заявіў, што літоўскі ўрад ня мае прычыны сьпяшыць, але — чакае прапазіцыі з боку польскага...

Адносна да праграмы перагавораў Вальдэмарас заявіў, што лічыць шкодным вылічаць яе пункты цяпер згары, бо — як пачне прэса дыскутаваць гэтую праграму, дык — змарнуюцца ўсе перагаворы...

Але, дадаў прэм'ер, ён можа згары сцьвярдзіць, што — усе навет найдрабнейшыя справы, якіх могуць даткнуцца перагаворы, цесна зьвязаны з асноўнымі палітычнымі пытаньнямі польска-літоўскага спору...

Трэба адзначыць, што ў той самы дзень, калі літоўскі прэм'ер даў сваю „гутарку" польскаму карэспандэнту, у афіцыяльным органе яго ўраду зьявілася перадавіца, пэўне-ж напісаная самім Вальдэмарасам, у якой той — дагаварываў даканца тое, што неяк недагаварыў, ці, можа, „не дапісаў" сам карэспандэнт „ПАТ'а"... Дык мы будзем карыстацца — абодвума тэкстамі заявы Вальдэмараса — польскім і літоўскім.

На перашкодзе да ўрэгуляваньня кажнай найдрабнейшай справы стаіць — „справа Вільні". — Літоўскі ўрад усьцяж непахільна стаіць на груньце... — „Сувальскага Трактату", які — „не скасаваны афіцыяльна ані Літвой ані Польшчай"... Пастанова Рады Паслоў зусім не скасавала таксама гэтага Трактату паміж Літвой і Польшчай, які, як адзіны існуючы ды падпісаны абедзьвюма старонамі, захоўвае сваю праўную сілу надалей...

А дзеля гэтага — Літва лічыць усьцяж заняцьце Польшчай Віленшчыны бясправўнай акупацыяй, якая павінна быць перадусім — скасавана, як толькі хутка і лёгка вырашацца ўсе спорныя справы паміж Польшчай і Літвой. Літоўскі ўрад — гатовы навет — адлажыць зварот Вільні Польшчай Літве, выключыўшы справу з перагавораў, але — Польшча павінна будзе толькі прызнаць зараз-жа — прынцыпова правы Літвы на Вільню. А з гэтага выплываюць слушныя жаданьні літоўскага ўраду — каб першым пунктам распачатых перагавораў была пастаўлена справа — сплаты Польшчай адшкадаваньняў за ўсе страты літоўскіх грамадзян і літоўскай дзяржавы, прычыненыя нападам на Вільню польскага ген. Жэлігоўскага... Бо-ж — літоўская ўлада, сьпешна пакідаючы Вільню ў 1921 г., аставіла там вельмі значнае і каштоўнае дабро, якое было бясправўна канфіскавана польскім урадам.

Другі перадуступны палітычны варунак магчымасьці распачацьця і пасьпеху перагавораў датычыць рэальных гарантыяў тэй „нятыкальнасьці літоўскай тэрыторыі і пашаны яе незалежнасьці", якія былі толькі дэкляраваны на словах марш. Пілсудскім...

Польскі ўрад павінен зараз-жа — выканаць на дзеле гэтую пашану.

1. Тым, што ён зьніме ўсе войскі ўдоўж усей дэмаркацыйнай лініі паміж Літвой і Польшчай, лініі, якую польскі ўрад няправільна называе „граніцай"...

2. Тым, што ўсе літоўскія эмігранты зараз-жа будуць высялены з Віленшчыны — як прынцыпова — Літоўскай, — у другія часткі Польшчы...

3. Тым, што — польскі ўрад — зачыніць цалком польска-літоўскую „граніцу" ўдоўж усей тэрыторыі Віленшчыны, каб цалком спыніць магчымасьць пераходу „граніцы" для... бандаў арганізаваных на тэрыторыі, якой валадае Польшча, — у Літву...

Асабліва пікантна гэта „перадуспнае трэбаваньне" — зачыніць граніцы цалком", перагаворы маюць мэтай якраз, здаецца, адчыненьне граніцы для нармальных стасункаў...

Без выкананьня цалком гэтых „перадуступных варанкаў" літоўскі прэм'ер лічыць магчымымі перагаворы толькі ў — вельмі абмяжаваных і чыста тэхнічных справах — галіне стасункаў паміж Польшчай і Літвой. Так, Вальдэмарас лічыць магчымым перагаворы ў справе... купляньня нафты і вугальля ў Польшчы для Літвы, ці лодзінскіх тканінаў. Толькі з тых частках Польшчы, з якіх Літва будзе купляць ды пускаць да сябе тавары, павінна быць цалком выключана... віленшчына... — Літоўскі ўрад ня можа дапусьціць ніякіх тавараў з Віленшчыны на літоўскія рынкі — бо інакш — зараз жа павінен будзе канфіскаваць.

Так сама літоўскі ўрад гатовы адчыніць абмен паштовай карэспандэнцыі з Польшчай, але ізноў, выбачайце, — толькі за выключэньнем Віленшчыны... — Бо ж — ясна, што літоўскі ўрад ня можа дапусьціць, каб дзяржаўная паштовая ўстанова Літвы прымала з краю лісты, адрэсаваныя — ў Вільню, ці Віленшчыну ў Польшчу... Бо-ж выразна гэта значыла-б, што Літва зраклася сваіх праваў на Віленшчыну. Паштовая карэспандэнцыя паміж Літвой і Віленшчынай можа адбывацца — толькі праз якое іншае места ў Польшчы, ці ў Нямеччыне, але ні ў які спосаб — беспасярэдне...

І такім спосабам — усялякія тэхнічныя стасункі — гандлевага і якога іншага абмену з Польшчай могуць наладзіцца даволі свабодна, але — толькі ж з запраўднай Польшчай, але — ня з Віленшчынай, якая, як гэта ня дзіўна на першы пагляд, — мае быць цалком выключана з усялякага беспасрэдняга абмену з Літвой, пакуль яна — ў польскіх руках...

Ад прапазіцыі прадстаўніка Польскага Тэлеграфн. Агенцтва — безадкладна наладзіць узаемна абмену тэлеграфнымі інфармацыямі, дапусьціўшы зараз-жа карэспандэнтаў афіцыяльных агенстваў, польскага ў Коўню і ў Варшаву літоўскага, — Вальдэмарас рашуча адмовіўся, заявіўшы, што і гэтая справа можа быць вырашана ў часе перагавораў...

На запытаньне карэспандэнта, чулага на „гістарычныя ўспаміны" аб слаўнай калісьці „польска-літоўскай дзяржаўнай мінуўшчыне", — ці яны нічога ня кажуць сэрцу літоўскага прэм'ера, гэты апошні адказаў: „Не, — нічога"... — прынамсь — нічога добрага... — Ён дадаў, што ўсе „праўна-дзяржаўныя пазывы (спрытнага карэспандэнта) на гэтую „супольную дзяржаўнасьць" ды „ўнію", якая быццам „праўна ня была скасавана — ані Польшчай, ані Літвой", ня маюць ніякага сэнсу: Польшча сама-ж якраз і скасавала ўнію, заявіўшы, не запытаўшы Літвы (і Беларусі, дадамо!), аб — „поўным аб'яднаньні ўсей Рэчыпаспалітай (у „Канстытуцыі 3 мая").

Але Літва апірае свае правы і прэтэнзыі на Віленшчыну — не на „гістарычных успамінах", а навет — не на „праўных давод ах, але — выключна на моцы дзяржаўнага інтарэсу Літвы...

Трэба сказаць, што толькі што ў адным з папярэдніх сваіх „гутарак" Вальдэмарас заявіў, што — „нязьбітая праўная падстава дамаганьняў Літвы адносна да Віленшчыны ёсьць — аддача гэтай тэрыторыі Літве яе праўным уласьнікам — СССР, які зьяўляецца законным спадкаемцам царскай Расеі"...

Цяпер Вальдэмарас кажа, што — „Літва пасьля вайны паўстала, як і Польшча — шляхом рэвалюцыйным, дзеля таго правы літоўскага народу на Віленшчыну — выплываюць з „інтарэсу дзяржавы літоўскай, — з маральнага права яго на яго сталіцу"...

На запытаньне карэсп. „ПАТ-а," ці — „ня прадбачыць літоўскі прэм'ер узнаўленьня дыплёматычных стасункаў з Польшчай, той — вось-жа лоўка адказаў, як адрэзаў:" — „А як жа: — літоўскі ўрад урачыста прыме польскага пасла, але толькі — ў Вільні"...

Дай-жа Божа нашаму калючаму цяляці — ваўка паймаці!...

Ліхвярства на вёсцы у Польшчы.

Польская сялянская прэса падае папросту страшэнныя факты і лічбы аб тым, як укаранілася на вёсцы ў Польшчы ліхвярства. Мы ведаем, што нядаўна польскі ўрад абвясьціў „паніжэньне законнага процанту" — з 14 проц. на 12 проц. гадавых. Гэта значыць, што, калі хто бярэ за пазыку больш, як 1 проц. у месяц, дык за гэта мае адказываць перад судом Але-ж — ведама-ж, што ўсялякія адміністрацыйныя загады ў фінансава-гаспадарчым жыцьці маюць вельмі благую вагу ды сілу. Дык вельмі цікаўна, які процант плоціць фактычна — і пасьля гэтага дэкрэту ўлады — страшэнна патрабуючая крэдыту сялянская вёска мясцоваму „прыватнаму капіталу", папросту — кулаком, памешчыкам ды іншым прафэсіянальным ліхвяром-спэкулянтам — за пазычаныя грошы.

Наагул разьмер працэнтаў хістаецца паміж — паўтара проц. і 14 у месяц, — ці найменшы проц., за які можа селянін здабыць грошы на вёсцы — перавышае законную норму ў паўтара разы, а найвышэйшы дык у 14 разоў...

Найбольш упарадкаваны прыватны дробны крэдыт, ведама, знаходзіцца ў заходніх абшарах Польшчы — былых нямецкіх правінцыях, дзе процант хістаецца паміж 2 проц. і 3 проц. — у месяц. Але — найвялікшы разьмер працэнтаў, як можна было спадзявацца, існуе ў былой расейскай Польшчы, а з ёй — на нашых беларускіх абшарах. Тутака — най-

ніжэйшы працант—3 проц., звычайны—6—8, а найвялікшы—далей на ўсход—аж 14 проц. у месяц.

Найвялікшая ліхва шалее на шырокім пасе, які ідзе ад сярэдніх паветаў Беласточчыны і Горадзеншчыны — 9—12 проц. у месяц; далей—праз заходнія паветы Палескага ваяводзтва—ахоплівае ўсю Валыншчыну, дзе оргія ліхвы даходзіць да 14 проц. у месяц. Дзіўнае зьявішча гэткай страшэннай дарагоўлі крэдыту навет у такім ураджайным краі, як Валынь, тлумачыцца — страшэннай патрэбай грошаў на адбудову краю пасьля ваенных спусташэньняў і—ведама-ж,—адсутнасьцю ўсялякай здаровай канкурэнцыі нармальна, правільна арганізаванай крэдытавай дапамогі насяленьню з боку дзяржавы. Бо-ж толькі такая канкурэнцыя здаровага, танейшага крэдыту можа зьменшыць, калі не забіць цалком, ліхву. А без гэтага ўсялякія найвастрэйшыя паліцэйскія загады і меры — будуць даваць толькі адваротныя рэзультаты: за дадаткавую рызыку адказнасьці перад судом ліхвяр будзе толькі накідаць дадатковы працант. Гэта зьявішча ведама кожнаму селяніну на месцы.

Польская сялянская прэса цьвердзіць, што — дзякуючы добрай арганізацыі банкаў дробнага крэдыту ў Віленшчыне і Наваградчыне — ня гледзячы на няменшае зруйнаваньне гэтых абшараў вайной дый на тры гады падрад неўраджаяў, размер працэнту тутака значна спаў. Быццам значную працу ў гэтай галіне зрабілі „Касы Колак Рольнічых“. Мы ня маем дакладных лічбаў з гэтай галіны. Цікаўна было-б даведацца з месцаў ад нашых карэспандэнтаў. Польскія крыніцы цьвердзяць, што тутака проц. хістаецца больш-менш у тых жа рубяжах, як і ў Кангрэсоўцы (б. расейскай Польшчы).

Можа, прычынілася да гэтага спадку ліхвы, а — пасрэдня — і да пэўнай працы ў кірунку прыбліжэньня да насяленьня ўстановаў дробнага крэдыту—і праца беларускага банку ў Вільні. Ня ведаем, наскольні пашырана ў нас учасьце беларускіх сялянаў у гэтых „Кулках Рольнічых“ ды іхніх Касах. Бо-ж, здаецца, усе факты і лічбы гэтай ліхвярска-крэдытовай статыстыкі польская сялянская прэса бярэ — з анкеты сярод касаў гэтых „колак“. Мы ведаем толькі, як агульнае зьявішча на нашых беларускіх абшарах, што—беларускаму сялянству страшэнна цяжка здабыць гатоўкавую пазыку,—як ад прыватнага крэдытара, таксама і ад грамадзка-урадавай крэдытавай установы. Калі падлічыць у процантах, — што плоціць зазвычай мясцовы хлебароб за пазыкі, як дадатковы процант да грашовага натурай—збожжам ці працай, — дык трэба думаць, што абліченьні польскай сялянскай прэсы акажуцца яшчэ залішне аптымістычнымі. Толькі асаднікі ў нас—адносна да таннага крэдыту знаходзяцца ў варунках, аб якіх беларускі селянін можа толькі лятуцець...

Дык барацьба з ліхвай — на нашых абшарах, трэба сказаць, — „крыху аднабокая“...

На гэтую палючую справу — шырокай барацьбы з ліхвярствам—шляхам стварэньня запраўды блізкіх да беларускага селяніна крэдытавых установаў павінны зьвярнуць нашы нова-выбраныя радныя беларусы ў вясковых самаўрадах.

На „усходніх крэсах“ Францыі.

Як ведама, Вялікая вайна ў значнай меры выклікана была сталым упорным жаданьнем Францыі—вярнуць свае парэйнскія правінцыі—Эльзас і Лётарынгію—адабраныя ў ёй немцамі—ў часе франка-прускай вайны 1970—71 г. г.

Скольні пісалася за гэтыя 40 гадоў у французкай прэсе—аб страшэнных цярпеньнях „чыста французскага насяленьня“ гэтых правінцыяў з боку прусацкіх уладаў,— дый аб іх нястрыманым імкненьні—вярнуцца „на лоно Мацежы“...

Але вось, у выніку вайны—зьдзейсьніліся ўсе найсьмялейшыя лятуценьні французкіх патрыётаў. — Споўніліся і так рэкламаваныя жаданьні „чыста французскага насяленьня „Эльзасу і Лётарынгіі“...

Але-ж—дзіўная рэч.—Ад часу навароту гэтых правінцыяў на французскае „лоно“ — французскія ўлады ў іх ніяк ня могуць пазбавіцца—новых клапотаў з гэтым „адвеку французскім насяленьнем“ гэтых—нова — набытых—„усходніх крэсаў“ Францыі...

Усе больш неяк высьвятляецца запраўды-ж папросту скандальны факт, што — гэтыя правінцыі, прынамся—адна з іх — Эльзас—зусім ня чуюць сябе больш французкімі, як нямецкімі...

Асабліва цікаўна, што абедзьве „крэсавыя“ правінцыі прызвычаіліся за нямецкія часы да шырокай аўтаноміі, ці — да вельмі значнай самастойнасьці выбарных правінцыяльных уладаў (самаўрадаў), да значных правоў мясцовага насяленьня, да кіраваньня сваім уласным лёсам. Дык паварот у край французкіх парадкаў, абапертых на панаваньні бюракратычнага (чыноўніцкага) цэнтралізму, быў прыняты ў абедзьвюх правінцыях з вялікім „няемакам“, каб не сказаць мацней. Асабліва ў нямецкім насяленьню Эльзасу пачалася выразная цяга... назад—да нямецкіх парадкаў, а, проста кажучы, дык і—да Нямеччыны... Пэўна-ж, што знайшлося шмат і так званых „нямецкіх агентаў“, якія давалі гэтай цязе тыя ці іншыя арганізаваныя формы... Можа, гэты рух прымаў часам ці часта і формы праступнай „здрады стану“... Але нас цікавіць тутака не французкая юрыдычная кваліфікацыя, але — выключна грамадзка-палітычнае зьявішча—выразных нямецкіх сымпатыяў мясцовага насяленьня Эльзасу, за паварот якога на лоно французкай „Мацежы“ праліта было столькі крыві ў Вялікай вайне... Нас займаюць тутака—тыя ненармальныя стасункі, у якія — без усялякага запытаньня самаго насяленьня краю—кінулі прымусова, як нейкую нячулую, нясьведамую рэч, вылізарную правінцыю пераможцу — ў выніку вялікай вайны... Прынцыпова ненармальныя варункі і стасункі, ведама-ж, павінны былі выразіцца перадусім у тым, што—намеж нацыянальна-палітычнай сьведамасьцю насяленьня і накінутым яму новай уладай палітычным „кодэксам карным“ павінны быў стварыцца прынцыповы „разнабой“, — сталася цяжкая супярэчнасьць, якая ў свой чарод павінна была выяўляцца ў „масавай праступнасьці мясцовага насяленьня“,—у бясспынаючыхся палітычных працэсах... Усе зьявішчы добра ведамыя на ўсіх і ўсялякіх „крэсах“, асабліва вострыя ў нашыя паваенныя часы...

—Ясна, што і французская ўлада пачала вострую барацьбу на сваіх „крэсах“ з „нямецкім сэпаратызмам“ насяленьня... Пасыпаліся бесканечныя „шпіёнскія афэры“, „змовы“, працэсы аб „паўстаньнях“, „здрадах“... Пачалося наступнае „паліцэйскае перараджэньне“ ўсякіх уладаў у краі, што толькі яшчэ больш псавала мясцовыя стасункі ў краі... Французская ўлада, і без таго страшэнна разхлапаная ўсім гэтым гучным палітычным скандалам з паваротам „на лоно“ сваіх правінцыяў, аканчальна азьвярэла, калі арганізаванае іх насяленьне, асабліва Эльзасу, выразіла ясна і бясспрэчна сваю волю — дамагаючыся аўтаномію краю... А больш крайнія ў ім элементы ўсьцяж давадзяць да шалу французскага ўладу — трэбаваньнем перагляду пастановы Вэрсальскага Трактату ў справе далучэньня правінцыяў да Францыі, дамагаючыся—ўсенароднага галасаваньня (плебісцыту) ў гэтай справе...

Ясна, што ўсё гэта робіцца ў краі—згодна французскай буржуазнай прэсе—„нямецкай агентурай“...

А дзеля таго—патрэбна толькі—staноўчая, жорсткая, пляновая палітыка ўлады—з яснай мэтай выкараненьня „нямецкіх уплываў“ у краі... Зразумела, што і гэткі лёзунг—„аўтаноміі для крэсаў“, — на самай граніцы з варожай дый інтрыгуючай усьцяж Нямеччынай, быў у Парыжу прызнаны — „антыпаньствовым“... Пачаліся новыя рэпрэсіі проці „аўтамамістаў“, якія ідуць, ня спыняючыся, да апошніх дзён... Толькі што ў Эльзасе ізноў арыштавана шмат павадыроў аўтанамістаў, якія—да разгляду справы ў судзе—пасаджаны ў мясцовыя „Вронкі“...

Усюдых, відаць, „крэсавае жыцьцё“ дый „крэсавыя справы“,—адвольнавыя...

— —

Апошняя сэнсацыя ў справе, так сказаць, „эльзаскай Грамады“ пушчана ў рух французскай газэтай „Матэн“ („Раніца — нешта ў родзе польскага „Кур. Паран.“). Гэтая газэта „даведалася“, быццам эльзаскія „грамадзісты“ імкнуліся да стварэньня... незалежнай „Эльзаскай Рэспублікі“, дый навет з прэзыдэнтам—немцам на чале... Быццам навет ужо была ўложана „ліста сяброў габінэту“... Дык дзіва, што французская буржуазія ўсіх гэтых паноў „міністраў“ разам з „прэзыдэнтам“—пасадзіла ў свае... рэспубліканскія вастрогі...

А здавалася перад вайной,—такія шляхотныя „мэты вайны“ абвяшчала французская вольналюбівая рэспубліка.

Выбарная хроніка.

Расейскія чарнасоценцы і на Віленскім груньце праваліваюцца.

9 студзеня расейскія чарнасоценцы з Р. Н. О. папрабавалі сваіх сіл на віленскім груньце, склікаўшы мітынг у залі Крэнгеля. На мітынг прышло пару дзесяткаў асоб, але, як аказалася, і з іх ня ўсе былі настроены на „іесьціньно всерускі“ дух. Першым прамаўляў манархіст Кузьміцкі, заклікаючы да падтрыманьня Р. Н. О. і яго выбарнай акцыі ўсіх рускіх людзей: і „рускіх беларусаў“ і „рускіх украінцаў“... (Цікава, што больш „рускіх народнасьцяў“ Кузьміцкі не ўспамінаў). Паводле яго думкі, ні беларусаў ні ўкраінцаў няма, а ёсьць толькі адзіна-руская, якія-б мусілі стварыць „Едзіную недзялімую“ Расею (тую Расею, што была пры цару!) і адмовіцца ад належнасьці да сваіх народнасьцяў.

Шмат бязглуздзіцы яшчэ плёў Кузьміцкі, але мусіць перакanaўся, што няма для чарнасоценцаў грунту ня толькі на правінцыі, а і ў Вільні.

І праўда, калі ён зачапіў нападамі іншыя ўгрупаваньні, што няйдуць разам з Р. Н. О.—то ўзьнік інцыдэнт, які не абыйшоўся без прымусовага выгнаньня з салі некалькіх асоб з Салагубам (ня зьмешваць з нашым паэтам) на чале — дзеячоў сярод віленскіх расейцаў, а за імі яшчэ выйшла шмат асоб у знак пратэсту і лік прысутных і да таго малы яшчэ паменшыўся.

Далей прамаўлялі іншыя прамоўцы — падобныя Кузьміцкаму і навет якісь Дубановіч прамаўляў пабеларуску, заклікаючы „все-рускіх“ людзей да аб'яднаньня. Але прамоўцы сваё гаварылі, а прысутныя „рускія людзі“ думалі аб сваім, дрэмлючы пад гук хрыплых галасоў прамоўцаў. Так, „всерускія“ паночкі, як відзіце, далёка з вашымі басьнямі не заедзеш, і „мужычка“ вам ужо ня ўдасцца абдурыць і мястовая інтэлігенцыя ад вас адкінулася, бо вы цяпер—заграпічныя птушкі на чужым груньце і „золотое времечко“ ваша даўно ўжо закацілася разам з каронаю Мікалая II.

Хто-б адкуль няўзяўся, а ўсё лабуніцца да нашага беднага беларуса.

Таксама і б. пасол Шапель. Быў калісь ён у N. P. Ch., пасьля здрадзіў сваім партыйцам, тварыў розныя сялянскія саюзы і „zjednoczenia“, а як сталі прыбліжацца выбары, захацелася зноў мандацік атрымаць, — дык зноў пачаў ліпнуць да беларускіх сялян. Нядаўна выпусьціў ён у вялікім ліку адозву да сялянства ў беларускай мове, у якой дакляруе і зямлю, і лясы, і лугі, і залатыя горы і муры і яшчэ здаецца штось і за гэта ўсё хоча вельмі мала: каб толькі сяляне нашы правялі яго ў паслы, галасуючы за „Ludowe Stronnictwo Ziem Litewsko-Białoruskich Zjednoczenie“.

А што ж можна спадзявацца ад такога чалавека, як Шапель, беднага і целам і духам, здрадзіўшага не адзін раз працоўных, як за быцьця яго ў Вызваленьні, так і па выхадзе з N. P. Ch.? Толькі здрады і ашуканства! Дык прэч з ім і яго адозвамі ў беларускай мове!

Прэч з ваўкамі ў авечай скуры!

Непаралікі ў жыдоў, што пашлі за блёкам меншасьцяў.

Як ведама, ініцыятарамі блёку меншасьцяў была жыдоўская і нямецкая буржуазія, звон золата і абяцанкі мандатаў якой пацягнуў за сабой шукаючых прыключэньняў — Ярэміча і Рагулі. Але-ж жыдоўская буржуазія ня можа прайсьці сваімі ўласнымі галасамі, ім неабходны галасы жыдоўскага мяшчанства і пралетарыяту. Як адных, так і другіх яны стараюцца абдурыць рознымі спосабамі і выстаўляюцца на вонак так, што быццам у-ва ўсіх жыдоў агульная згода і паразуменьне, адным словам Хірым. Але ў сапраўднасьці так ня ёсьць. Унутры жыдоўскіх купцоў і прамыслоўцаў ідзе ўпорлівая барацьба за тое, хто мае атрымаць мандаты.

Віленскія купцы ні за што ня хочуць, каб на „крэсавых“ вокругах прайшлі цэнтральныя купцы, а галоўнае, чаго ня хоча ўся жыдоўская буржуазія—каб не прайшоў у паслы бяднейшы элемэнт — з мяшчанства і асабліва з пралетарыяту.

Дзеля гэтага знойдзены вельмі хітры спосаб. Кандыдат, які б хацеў прайсьці па жыдоўскаму сьпіску—мае ўнясьці 3.000 зл. на выбарную акцыю. Ясна, што такую суму змогуць унясьці толькі багацейшыя—буржуі. Але гэтым самым паўстае запэўненьне, што ня пройдзе ў паслы ніякі бяднейшы (мешчанін, а тым больш пралетар). А гэтага якраз і трэба жыдоўскай буржуазіі.

Дык вось якімі ганебнымі ашуканствамі адсоўвае жыдоўская буржуазія ад пасольскіх мандатаў жыдоўскую беднату! А на вокал—Хірым, усе жыды мусяць галасаваць за жыдоў у сьпіску меншасьцяў, незалежна ад таго—ці ён багаты ці бедны.

Немагчымы падзел паветаў на выбарныя абводы.

Падзел паветаў на абводы ў многіх мясцох зроблены так, што шмат якія вёскі апынуліся за 10-15 вёрст ад абводаў. Так у Валожынскім павеце вёска Панізьзе належыць да абводу ў в. Міхалове за 8 вёрст, а вёска Бурнякі, якая знаходзіцца за 1 вярсту ад Міхалова, далучана да выбарнай камісіі за 12 вёрст. Дык селянін—хадзі па столькі вёрст. Ясна, што гэта адаб'е ў многіх сялян ахвоту да выбараў. І ведама-ж, таксама, хто на гэтым скарыстае.

А ў некаторых мясцовасьцях падзел на абводы яшчэ горшы. Трэба змагацца з гэтым усімі спосабамі, але найпоўнейшы спосаб — дык гэта вытрываласьць. Хоць за 20 вёрст трэба іесьці ўсім і мужчынам і жанчынам і аддаць свой голас за свой нумар працоўных, каб такім чынам ня выкарысталі гэтага нашы ворагі.

Новы рыбалоў у нашых водах.

Гэтымі днямі выходзіць на лоўлю галасоў бес „Apartyjny Komitet Pracy Państwowej w Wilnie“, які будзе лавіць пераважна беспартыйных... Ці не зашмат ужо гэтых рыбаловаў? Трэба парадзіць яму навучыцца спэцыяльнае літаньне ад Ярэміча і нашых духоўных айцоў, якое яны выдалі, як „Выбарную плятформу“—а то бяз гэтага рыбка—проста, як зачарованая—ня ловіцца.

Другая Рада—зробіць разам з Умястоўскім—(абавязкава!) аблаву з усіх канцоў на гэтую рыбу, каб выдала хоць адзін голас.

А можа станецца дзіва—рыба выдасьць голас! Чаго не здараецца ў нас?!

Розны лёс трох малайцоў французскага крыла б. Н. П. Х.

Нашым чытачом пэўна вядома, што ў даўнейшай Н. П. Х. былі свае Сабалеўскія, і то аж тры: Бон, Шакун і Шапэль, якія па сваіх прозьвішчах зьяўляюцца пэўна французамі, што іх, магчыма, й лучыла.

Але неспадзявана лёс іх разлучыў... у тры дарожанькі. Шакун сядзіць у турме, Бон—выдае ў Беластоку газэту на расейскай мове: „Заря“, (для всех рускіх народностей), Шапэль—склікае гэтымі днямі да Вільні... вялікае беларускае веча!

Ходзяць чуткі, што гэтым тром французкім малайцом прапанована „пачэсная“ роля... „rozbijaczów“. Згодна таму, як аднясьліся кожны да прапазіцыі — такі іх спаткаў і лёс!

Будзем бачыць веча гэтага паўграматнага п...асла!

Выбары павінны быць „чыстыя“.

Пад гэткім загалоўкам нядзельны „Robotnik“ друкуе наступную стацейку.

„У працягу некалькіх тыдняў мы адтрымліваем з розных канцоў краю вельмі няпрыемчыя для нас весткі. Датычацца яны рознага віду націску, які робіць дзяржаўная адміністрацыя на выбаршчыкаў, каб прымусіць іх галасаваць на дзяржаўны сьпісак. Мы былі вельмі асьцярожныя. Мы правяралі кажную вестку асобна. У дзевяці дзесятых весткі, на жаль, аказаліся праўдзівымі. Дзеля гэтага мы бярэм слова. Можам фактамі даказаць кожнае слова гэтай стацейкі. Прадстаўнікі ўлады пагражаюць розным палітычным і грамадзкім дзеячам, абяцуюць ім розныя рэчы, ужываюць такіх спосабаў, як выдаваньне крэдытаў дробным землеўласьнікам і т. п. Старасты арганізуюць сходы і выбарчыя „саюзы“. Перад намі стаіць цень афіцыяльных кандыдатур, так ненавісных у Францыі ў эпоху Напалеона IV. Маёвы пераварот прайшоў пад лёзунгам „вельмі шмат несправядлівасьцяў пануе ў Польшчы“. Масы тады паверылі ў гэты лёзунг, паверылі горача, бескарысна.

Хіба гэта, аб чым мы пішам не зьяўляецца страшэннай несправядлівасьцю, атручываючай сумленьне ўсяго пакаленьня? Выбары, „робленыя“ адміністрацыяй, выбары, у часе якіх староста перастае быць прадстаўніком дзяржавы, а зьяўляецца прадстаўніком партыі, няхай навет „дзяржаўнай“, зьяўляецца ня толькі сьмяротным ударам у сэрца дэмакратыі, але таксама беспаваротнай лекцыяй дзеля дзяржаўнага самасьвядомасьця ў грамадзянстве“.

Запраўды п. п. з П. П. С. прыходзіцца прасьлявіцца. Цяжка будзе ў такіх абставінах заспакоіваць масы песенькамі аб дэмакратыі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Драматычны мамэнт — у лёсе „прэсавых дэкрэтаў“.

У апошнія дні—пэўне-ж — у зьвязку з выбарнай кампаніяй—урад выдаў яшчэ „дадатак“ да прэсавых дэкрэтаў, якія, здавалася-б, і без таго ўзялі добра „пад жабры“ прэсу ў краі. Бо-ж „дадатак“ гэты яшчэ далей завастрае „пазуры“ скарпіёнаў, зьмешчаных у дэкрэтах. „Дадатак“ — ізноў адбудоўвае тую адказнасьць фактычных рэдактароў, якая была ў першым дэкрэце, але якая скасавана была навет самім урадам у другім дэкрэце...

Але ў тых днях „прэсавыя дэкрэты“ будуць перажываць вельмі драматычны мамэнт. А іменна—аб іх праўнай сіле мае выказаць сваю „аўтарытэтную апінію“ найвышэйшы суд у Польшчы. Бо-ж да гэтай найвышэйшай судовай інстанцыі дайшла справа рэдактара газэты „Глос Любельскі“, абвінавачанага нейкім абражаным газэтай судзьдзёй. Рэдактар давёў справу да Найвышэйшага Суду, пазываючыся паміж іншымі давoдамі і—няпраўным тасаваньнем прэсавага дэкрэту, скасаванага Соймам.

Газэта, здаецца, эндэцкая. Дык Найвышэйшаму Суду трэба будзе вытрымаць вельмі цяжкі „экзамен судзейскага сумленьня і грамадзкай адвагі“, баронючы аднача́сна — справу канстытуцыі і эндэцыі—проці ўраду.

Адміністрацыя ня сьпіць.

Гэткімі днямі адбыўся ў Варшаве зьезд прадстаўнікоў „сярэдняга стану“. (Рамесьнікаў, купцоў і вольных прафэсіяў). На зьезьдзе выступалі з прамовамі міністар Складкоўскі і дырэктар банку „Gospodarstwa Krajowego“. Дырэктар ім абяцаў, што рамесьнікі і купцы будуць атрымліваць крэдыты, і зьезд, ведама, выказаўся за дзяржаўны блёк. Прыводзячы яшчэ цэлы рад падобных фактаў „Gazeta Warszawska“, піша, што „робяць націск праз орган адміністрацыі на сфэры, залежныя ад улады, каб прылучаліся да блёку і падтрымлівалі яго акцыю“...

„Выбарчую акцыю за дзяржаўных кандыдатаў вядуць дырэктары дзяржаўных банкаў, ваяводы, старасты, школьная ўлада — значыць органы, прызначаныя зусім для чаго іншага“.

Зачынілі зьезд.

У Луцк на гэтых днях сабраліся ўкраінскія палітычныя дзеячы на зьезд. У першы жа дзень зьявілася паліцыя і яго зачыніла. На зьезьдзе прыймаў удзел былы пасол Падгірскі, сябра Сельроба Федарчук, рад сяброў „Прасьвіты“ і інш.

У памешканьні „Прасьвіты“ зроблена была рэвізія.

Уплыў фашыстаўскае агітацыі.

Як ведама, фашысты ўсіх дзяржаў распаўсюджваюць думку, што дзяржаўная ўлада стаіць вонку клясавых інтарэсаў і незалежна ад усякіх клясаў. Дзеля гэтага яны радзяць забыцца аб клясавай барацьбе, аб партыях і т. п. (Буржуазіі і яе ўладзе запраўды было-б ня кепска, калі-б рабочыя і сяляне ня думалі аб клясавай барацьбе і партыях). Гэтая фашыстаўская тэорыя знайшла дзіўныя водгукі. Група сялян Ляскага павету (па ўсёй магчымасьці, кулакі) зьвярнуліся да Пілсудскага з лістом, у якім просяць парадзіць ім, за каго галасаваць, дзеля таго, што яны ня любяць ніякіх партыяў.

Вось дык знайшлі дарадчыка!

Водгукі вялікага працэсу.

У часе палітычнага працэсу Пурмана, Здзярскага і інш. надсудныя зрабілі дэманстрацыю ў судзе. За гэта прыцягнулі да адказнасьці Пурмана і Райхэра, а таксама жонку засуджанага Левандоўскага і яе сваяка Мілеўскага. За гэты час Пурман здолеў уцячы з турмы, а Рархэра вымянілі; Мілеўскі засуджаны на 6-ць месяцаў турмы, а Левандоўская на 10-ць дзён арышту.

Цікаўная апінія нямецкай прэсы аб польскіх выбарах.

Орган нямецкіх дэмакратаў піша аб польскіх выбарах, прадбачучы на іх перамогу лявіцы. Тады, кажа ён, Пілсудзкі навінен будзе—або паразумецца з лявіцай, або — разагнаўшы Сойм, абвясьціць фармальную дыктатуру. Вынікі такой дыктатуры — пры ўсё-ўзрастаючым у краі камунізьме былі-б проста неаблічальнымі. Але, здаецца, газэта — з слоў свайго варшаўскага карэспандэнта прадбачыць слушна і іншую магчымасьць: „лявіцовы" Сойм (з пэпэсаў ды вызваленцаў дый усялякіх іншых польскіх „сялянаў") можа і сам „паразумецца" з марш. Пілсудскім. Пілсудскі „можа адыграць гістарычную ролю, украпіўшы ды пашырыўшы выканаўчую ўладу", аднačасна — далей „украпіўшы правы парляманту"...

Вось гэта—дык праўда!..

Заграніцай.

Быццам—„новы курс—радавай замежнай палітыкі".

Маскоўскі карэспандэнт „Кур. Варш." даведаўся, быццам радавыя кіруючыя колы пастанавілі значна зьмяніць курс заграпічнай палітыкі ССРР—у напрамку паразуменьня з дзяржавамі Заходу. Перадусім мае быць асягнута паразуменьне з Францыяй, а пасьля і з іншымі.

Быццам — у зьвязку з гэтым — Сталін „парадзіў" Камінтэрну затрымаць асыгнаваныя ўжо ім значныя крэдыты на акцыю ў Кітаі. Можа і так. Але—прасьцей зразумець затрыманьне кітайскіх крэдытаў — перанясеньнем цэнтра акцыі — пад англійскую Індыю—у Афганістан.

Магчымасьць паходу ССРР на Індыю.

У зьвязку з гэтай весткай радавай прэсы—цікаўна прывясьці і тыя запраўды-ж сэнсацыйныя весткі, якія зьмяшчае нямецкая прэса—у справе—падрыхтоўкі радавага ўраду да паходу на Індыю праз Афганістан...

Газэта ўжо падавала вестку аб тым, што ў апошні час страшэнна ажывілася праца „агентаў" Комінтэрну ў Індыі, дзеля чаго Цэнтраля ўсей азіяцкай арганізацыі апошняга перанесены з Кітаю—у Туркестан.

Быццам у Ташкеньце... детальна распрацаваны плян паходу ў Індыю — праз Афганістан. Ужо зусім падрыхтаваны да апэрацыяў дзьве найлепшыя ваенныя базы — на шляхох з Туркестану ў даліну Інда — праз Кабул і Кандагэр (вялікшыя месты Афгістану, першае — сталіца). У Кабуле радаваму паслу афганскі ўрад — ня гледзячы на апор англійскай агентуры, даў дазвол на збудаваньне вялікай базы радавага паветранага флёту, якая зьяўляецца канцавым пунктам паветранай лініі Ташкент — Кабул.

Ваенныя колы Афганістану вельмі прыхільны да радавых дамаганьняў, і працаў — над палепшэньнем дарогаў, лучачых афганскія цэнтры з радавай тэрыторыяй.

У Маскве таксама распрацованы шырокі плян паходу на Індыю. Важнае значэньне маюць у зьвязку з гэтым пасьпехі радавай дыплёматыі ў Пэрсіі, з якой ёй удалося канчальна выцісьнуць англійскія ўплывы. Апошні рашучы пратэст Пэрсіі проці палітыкі Англіі ў Іраку—ярка даказывае гэта.

Што пляновыя ўзаемныя падкопы—Англіі пад ССРР і ССРР пад Англію—ідуць па ўсяму сьвету, дзе толькі здолеюць рабіць гэта абодва прынцыповыя ворагі, у гэтым няма сумліву. Але—ці запраўды выбухне паміж імі беспасрэдня вайна, дый, як прадбачыць радавая прэса — „праз некалькі месяцаў", гэта—сумліўна.

У англійскай Індыі пачаліся забастоўкі.

У м. Бамбэі пачалася вялізарная забастоўка на фабрыках тканіны. Бастуе 10.000 работнікаў. Усе фабрыкі заняты паліцыяй.

Важнае здарэньне ў Індыі.

У працягу апошніх гадоў у Індыі ўсьцяж здараліся „выпадкі" крывавых сутычак дый запраўднай узаемнай бойні — паміж індусамі і мусульманамі. Ясна было кожнаму наглядчыку звонку, што гэтая „рэлігійная" грызьня ды вайна паміж насяленьнем краю — толькі на руку англійцам. Пэўне-ж англійцы цішком цкавалі адну на адну — часткі насяленьня, каб лягчэй было няволіць — і мусульманаў і індусаў.

Але ўрэшце разумнейшыя павадыры групаў насяленьня зразумелі, каму ідзе на карысьць, а каму на згубу гэтая недарэчная крывавая калатня, і вось нядаўна ў Мадрасе сабраўся кангрэс, на якім былі прадстаўнікі — як індусаў, таксама і мусульманаў. Такі супольны кангрэс нядаўных заклятых „рэлігійных" ворагаў зусім нячуванае, нябывалае зьявішча ў Індыі — даводзіць аб вялікай сьпеласьці нацыянальна-сацыяльнага вызваленчага — проціанглійскага — руху ў Індыі.

Кангрэс прыняў рад рэзалюцыяў, у якіх, — заклікаючы народ да пашаны кожных рэлігійных перакананьняў, указывае—на супольную ўсім народам і вызнаньням Індыі задачу—вызваленьня з-пад англійскай апекі і імкненьня да поўнай незалежнасьці...

Англійскі ваенны міністар ў Афганістане...

Радавая прэса б'е трывогу з прычыны раптоўнай падарожы англійскага ваеннага міністра ў Афганістан... Прэса слушна тлумачыць гэтую дзіўную цікавасьць англійскага ўраду Афганістанам небясьпечнымі падрыхтаваньнямі яго да вайны з ССРР — да нападу на Туркестан з боку Афганістану, якога спадзяецца навет — праз некалькі месяцаў...

Няменш дзіўную падарожу робіць і афганскі эмір, які ў апошнія дні аказаўся — у Варшаве. Радавая прэса пісала, што спадзяецца яго візыты ў Маскву, а ён чамусьці заехаў—у Варшаву...

Магчымасьць збліжэньня між Японіяй і ССРР.

Старшыня „асаблівай місыі" — дыпляматычнай і гандлёвай, — высланай японскім урадам у Маскву, заявіў, як даносіць радавая прэса, што — ён атрымаў з свaей падарожы ў ССРР такое неспадзявана добрае ўражаньне, адносна пасьпехаў ССРР у галіне гаспадарчай і культурнай працы, што, вярнуўшыся ў край, будзе націскаць на ўрад, каб хутчэй зрабіў усё магчымае дзеля — найбліжэйшага цясьнейшага збліжэньня Японіі з ССРР. Першым крокам да гэтага будзе заключэньне гандлёвага трактату паміж абедзьвюма дзяржавамі.

Англійская прэса з трывогай глядзіць на акцыю гэтай місіі гр. Гото. Яна піша, што Японія быццам прапануе ССРР — паразуменьне ў супольнай працы ў Манчджурыі і Манголіі.

Радавыя газэты падчырківаюць — урачыстае спатканьне і авацыі, якія зроблены японскай місыі—урадам і народам у Маскве.

Цікаўны — проці-англійскі рух у Японіі.

Як ведама, у Японіі за апошнія 50 гадоў, асабліва — пасьля вайны з Расеяй, — англійская мова была быццам „другою афіцыяльнаю" моваю ў краі. Можна сказаць нават, што англійская мова дагэтуль — „другая нацыянальная мова" японца.

Яшчэ ў прошлым годзе ў 500 японскіх сярэдніх школах было — 3000 вучыцялёў англійскай мовы... У школах англійскай мове аддана аж 7 гадз. у тыдзень... І вось раптам, адзін з найвялікшых вучоных прафэсараў-пэдагогаў Японіі гр. Сасазакі — падняў „сьцяг бунту" — проці гэткага становішча чужой мовы ў краі. Ён наладзіў анкету, адказы на якую далі зусім неспадзяваныя для англійцаў рэзультаты.

Толькі 1% адказаў высказаўся за тое, каб пакінуць усё па-стараму: 75 прац. — за рашучае абмяжаваньне выкладаньня англійскай мовы ў школах, а 24 прац. — за поўнае выгнаньне з школы гэтай „чужой і — цяжка мучаючай мовы".

Мілітарыстычнае „шыла" з пацыфістычнага "мяшка".

Адна з англійскіх газэт неасьцярожна пахвалілася тым, што англійскія афіцэры і пілоты (кіраўнікі самалётаў), якія служаць на падводных лодках, маючых у сябе самалёты, атрымалі дадаткі да пэнсіяў... Англійскае марскоe міністэрства аж „валасы стала рваць на галаве" — з прычыны такой дурнаты газэты, выбаўтаўшай важны сэкрэт англійскага флёту.

„Саюз" Англіі з Эгіптам.

Эгіпецкая прэса даведалася аб тайных перагаворах, якія вядзе прэм'ер Эгіпецкага ўраду з высокім камісарам Англіі ў Эгіпце. Быццам гэтыя перагаворы ўжо скончаны, а зараз-жа маюць распачацца — афіцыяльныя, адкрытыя. На запытаньне журналістаў прэм'ер Сарват-паша ня даў ніякіх высьвятленьняў — навет аб тым, што ўрад рабіў у часе перагавораў ды пабыту караля ў Лёндане. Прэм'ер заявіў толькі аб жаданьні караля Эгіпту—заключыць саюз з Англіяй. Як ведама, кароль Эгіпту—спэцыяльна вышуканы ды створаны быў—паводле англійскага спосабу — Англіяй, дык ясна, які „саюз" будзе мець край „незалежны"—сябра Лігі, які фактычна знаходзіцца пад ботам Англіі.

Будзённы, Дыбенко і Егораў—на польска-радавай граніцы.

У апошнія дні сябры Ваенна-Рэвалюцыйнай Рады—Будзённы, Дыбенко і Егораў зрабілі інспэктарскі агляд войскаў, разьмешчаных удоўж польска-радавай граніцы. У сьцягу местаў зроблена ваенная пробная трывога.

Прадстаўнік Сэкрэтарыяту Лігі Нацыяў у Коўні.

Сэкрэтарыят Лігі Нацыяў паведаміў літоўскі ўрад аб тым, што ў Коўню мае прыехаць адзін з дырэктароў Сэкрэтарыяту — дзеля ...паразуменьня з літоўскім урадам у справе выкананьня рэзалюцыі Рады Лігі адносна ўнаўленьня стасункаў з Польшчай... Як ведама, пасьля свайго павароту з Жэнэвы Вальдэмарас зрабіў цэлы шэраг заяваў, у якіх можна ўбачыць усё, апрача толькі жаданьня выканаць гэтую „раду" Рады Лігі—адносна паразуменьня з Польшчай.

Быццам літоўскія ўрадавыя колы вельмі ўстрывожаны візытай прадстаўніка Лігі.

Ізноў новы „замах стану" ў Літве.

Літоўская паліцыя ізноў выкрыла „замах стану", падрыхтаваны сацыял дэмакратамі і „сацыял-людоўцамі". Масавыя арышты зроблены ў шэрагу местаў—усходняй Літвы: Вількаміры, Марыямполі, Жыжмарах, Шырвінтах, Біршах і інш. Усяго арыштавана каля 120 асобаў.

Усе арыштаваныя вывезены ў глыбіню краю ды парассаджаны па вастрогах.

Малая Антанта — у справе ваеннай кантрабанды з Італіі ў Вэнгрыю.

Дзяржавы Малай Антанты, а перадусім — Югаславія — страшэнна ўсхваляваны, раскрыўшайся авантурай з нелегальнай дастаўкай амуніцыі Італіяй Вэнгрыі, над якой вялікія дзяржавы паставілі Малую Антанту жандармам і якая павінна быць — безаружнай...

Трывога гэта — настолькі сільная, што кіраўнікі гэтых дзяржаваў быццам пастанавілі экстарна склікаць раней тэрміну канфэрэнцыю Малай Антанты — дзеля таго, каб цалком высьветліць справу дый — запратэставаць супольна проці — італьянска-вэнгерскаў „правакацыі"...

„Замірэньне стасункаў" на Балканах.

Як ведама, Баўгарыя, якая ў часе вялікай вайны ваявала на баку Цэнтральных дзяржаваў (Нямеччыны і інш.), была ў выніку пабеды саюзьнікаў — страшэнна абрэзана тэрытарыяльна і наагул—„накарана"... Страшэнна пацярпеў народ, цар якога жанаты на сястры самога Вільгэльма — кулямётамі гнаў на бойню... У выніку „міру" страшэнна завастрыліся і без таго агідна-дрэнныя стасункі між баўгарамі і іх суседзямі — сэрбамі, грэкамі ды румынамі, — якія ўсе ніяк не маглі яшчэ да вайны наразхавацца ў-ва ўзаемных крыўдах — ад часу I і II Балканскіх войнаў, у значнай меры справакаваных — ну, ведама-ж — „вялікімі дзяржавамі-дабрадзеямі, з якіх — адны „пратэгавалі" Баўгарыю, другія Сэрбію, трэйція — Грэцыю, — каб урэшце — усіх кінуць на братазабіўчую вайну...

Цяпер ізноў пачынаецца старая музыка на Балканах... Ідзе барацьба за ўплывы на Балканах паміж Італіяй і Францыяй... Дык ясна-ж, што „пацыфікацыя стасункаў" на Балканах ідзе шпаркім тэмпам, але—неяк дзіўна... Ворагі — Баўгарыя і Грэцыя — пад уплывам Італіі — неяк збліжаюцца, каб зрабіць... супольны фронт — проці Югаславіі, якой страшэнна зайздросьцяць за яе „першую ролю на Балканах"... Італіі, якая хоча захапіць ўплывы на Балканах, выцясьніўшы адтуль Францыю, падтрымліваючую Югаславію, — ня выгадна, каб на Балканах існавала адна значна магутнейшая ад іншых дзяржава — Югаславія: лепш, каб былі меньш-больш усе роўнай сілы — тады лягчэй панаваць на Балканах Італіі, пасварўшы іх усе.

І вось — пад уплывам італьянскай дыплёматыі наладзілася ўжо канфэрэнцыя ў справе ўзаемнага паразуменьня паміж Баўгарыяй і Грэцыяй. Канфэрэнцыя зьбярэцца ў палове студзеня ў Софіі (сталіца Баўгарыі). Паразуменьне пачалося ў Жэнэве — у часе апошняй сэсіі Рады Лігі. Пасьля сэсіі грэцкі міністар Міхалопулос адразу паехаў у Рым — на спатканьне з Мусоліні, з якім, як сам заявіў пасьля павароту, — меў вельмі важныя гутаркі — у справах палітычных і фінансавых...

Пэўна-ж — за патрэбную Італіі „палітыку" атрымаў — патрэбныя Грэцыі „фінансы": — ясна, як дзень...

Далейшае „братаньне" Італіі з Грэцыяй.

Італія ўсьцяж працуе над „акружэньнем" Югаславіі на Балканах.

Апошнія весткі кажуць ужо аб — новым трактаце ваеннай прыязьні Італіі і Грэцыі, яўна скіраваным проці Югаславіі, а ўкосна і — проці Францыі. Вестка падана югаслаўскай прэсай, якая са злосьці пэўне-ж дадала шмат абразьлівых для Грэцыі „дэталяў" трактату. Але наагул у факце можна не сумлявацца.

Румынскія палітыкі нюхаюцца з прынцам Каролям.

Апазіцыйныя румынскія палітыкі вядуць усьцяж перагаворы з прынцам Кароля, які мае рашучы намер, выбраўшы суадказны мамэнт, прыехаць у край — пэўне-ж не дзеля таго, каб... пацалаваць свайго каханага сынка, „Караля Міхайлу I", як цьвердзіць сам. Толькі ў Канстантынопалі раскрыта арганізацыя румынскіх „карлістаў", якая мела намер прывязьці Кароля сюды, у сталіцу Турцыі, а адсюль — аэраплянам — даставіць у край.

Чэха-Славацкая Рэспубліка ня йдзе пад каманду Ватыкана.

У клерыкальнай часткі чэшскай прэсы зьявіліся весткі — аб тым, быццам урад Рэспублікі — у праекце конкордату (трактату) з Ватыканам (урад Рымскага Папы) — зрабіў важныя ўступкі апошняму. На гэтыя весткі чэха-славацкія ўрадавыя колы адказалі—рашучым запярэчэньнем. Запярэчэньне кажа, што ўрад рашуча адкінуў дамаганьні Ватыкану — аб поўным звальненьні ксяндзоў дый усіх клерыкаў ад ваеннай службы, дый што наагул праект конкардату не зьмяшчае ніякіх пастановаў, якія-б супярэчылі сувэрэннасьці дзяржавы і духу рэспубліканскай канстытуцыі Чэха-Славаччыны.

Ці можна тое ж сказаць пра конкордат Польшчы з Ватыканам, зроблены ведамым Ст. Грабскім, які рабіў яго, як хацеў, радзячыся толькі з сваімі эндэкамі ды біскупамі, а пасьля — у Рыме — з кардыналамі ды самім Папай?.. А з Рыму прывёз трактацік ужо зусім гатовым, у якім ужо ня можна было зьмяніць — дый і не зьмянілі — ані воднага слоўца...

Водгукі „мірнай прапазіцыі" Амэрыкі.

„Мірная прапазіцыя" амэрыканскай буржуазіі, якая — побач з заклікам іншых да міру, сама распачала рашучую ваенную акцыю — з мэтай канчальнага захвату незалежнай рэспублікі Нікарагуа, (якая вельмі „патрэбна" Амэрыцы — бо праз яе тэрыторыю праходзіць канал, лучачы Атлянтыцкі акіян з Ціхім) — выклікала ўжо шмат водгукаў у прэсе. Але цяпер пачалі даходзіць да прэсы і афіцыяльныя адказы дзяржаў на гэтую прапазіцыю. Францыя згадзілася на прапазіцыю Амэрыкі, але патрэбавала, каб у праекце трактату было выразна сцьверджана, што забараняецца, як міжнародавае праступленьне, вайна толькі зачэпная, але не абаронная. Але зараз-жа быў атрыманы на гэта адказ Амэрыкі, што яе — не здаволівае адказ Францыі з такой засьцярогай... І запраўды-ж — заўсёды можна вытлумачыць усялякі ваенны пачын, як абаронны.. Нямецкая стратэгія выразна вучыць, што — найлепшым, калі не адзіным, спосабам абароны зьяўляецца... наступленьне. Паміж „саюзьнікамі" і немцамі ідзе дагэтуль спрэчка аб тым, хто пачаў вайну, хто яе выклікаў... Але вырашыць гэты спор — страшэнна цяжка, кожны, хто пачынае вайну, можа цьвярдзіць, што ён пачынае дзеля таго, каб лепш абараніцца...

Дый — як паразумеюцца Францыя з Амэрыкай, — ня ведама...

Атрымала, здаецца, Амэрыка ўжо і японскі адказ, у якім Японія згаджаецца з думкай Амэрыкі — наагул ды цалком асудзіць як зачэпную ці захватную таксама і абаронную вайну... Японія ўлёт зразумела, аб што Амэрыцы ідзе, дык згаджаецца на ўсё, каб толькі... не перашкаджала ёй—у яе плянова-захватнай працы ў Кітаі, як і яна—ня будзе ўмешывацца ў такую-ж акцыю Паўночна-Амэрыканскага волата — у Сярэдняй Амэрыцы... Бо-ж трэба думаць, што — галоўнай думкай і мэтай, укрытай у амэрыканскай „мірнай прапазіцыі", ці — „праекту новай Лігі вялікіх дзяржаваў" — зьяўляецца якраз — намер напомніць рашуча ўсім сябром — вялікім дзяржавам Эўропы і Азіі, што — „Амэрыка існуе для амэрыканцаў", ці — правільней: для Паўночных Штатаў Амэрыкі... — дык — усё, што робіцца цяпер Амэрыкай у Нікарагуа, а можа зараз-жа распачнецца і дзе інш, усё гэта — вылучна датычыць Амэрыкі, але не датычыць іншых вялікіх дзяржаваў...

Здаецца, так і трэба разумець „мірную прапазіцыю" Амэрыкі...

Ільмень.

ГІМН.

Усе чулыя сэрцам! Усе душы жывыя!
Старонкі працоўнай сыны!
Пагляньце на сьцягі свае баявыя —
Пакрытыя славай яны!

Насіцель іх роўны і віхру і грому...
Узьнясецесь да сонца, да зор!
Арлятам пабедаў — народу жывому —
Ня страшны сусьветны прастор!

Іх сілу магутную ўнукі праслвяць...
Хай чуе народаў сям'я!
Са ўсходу на захад лунаць будзе памяць...
Іх век не забудзе зямля!..

Вронкі, 7/XI. 1927 г.

Наша хроніка.

У страха вочы вялівія. Курвіленцы забілі трывогу з прычыны „gorączkowej pracy" Камітэту „Сял.-Работніцкага Аб'яднаньня", які можна судзіць—хоча адабраць у кіраўнікоў органу („Kur. Wil.") мягкі хлеб.

Трывога ня зусім дарэмная, можна думаць!

Хвароба Ан. Луцкевіча. Як нам перадаюць, гр. А. Луцкевіч, заарыштаваны тры месяцы назад і пасаджаны на Лукішкі (знамянітыя Лукішкі!), чуе сябе зусім дрэнна. Пераведзены ў турэмную бальніцу—ён амаль увесь час ляжыць у ложку. Жаліцца на агульную слабасьць у-ва ўсім целе і боль галавы.

Перадаюць, што сам А. Луцкевіч называе сваю хваробу болем за адлучаны ад яго беларускі працоўны люд і за лёс надыходзячых выбараў.

Паслы Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады перавезены з Вронак у Вільню. У зьвязку з прыбліжэньнем працэсу Белар. Сялянска-Работніцкай Грамады ў Вільні перавезены сюды і асаджаны ў Лукішскім вастрозе б. паслы: Тарашкевіч Браніслаў, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Мятла Пётра і Валошын Павал. Разам з імі перавезены ў Вільню Бурсэвіч Максім і Акінчыц Фабіян. З Вронак у Вільню ехалі арыштаваныя ў спэцыяльным вагоне пад сільнай ахранай паліцыі. Са станцыі на Лукішкі вязьлі іх аўтамабілям, пад сільнай ахранай коннай паліцыі.

Да працэсу Грамады. Судзячы па газэтных вестках, судовыя ўлады парашылі разьбіць вялікі працэс б. Беларускай Сялянска Работніцкай Грамады на некалькі групаў, якія будуць суджаны па розных Акружных Судох. Працэс гэт. зван. віленскай групы, налічваючай 56 асоб, адбудзецца ў канцы лютага. З іх б. паслы — Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Мятла, б. дырэктар гімназіі Астроўскі, гр. гр. Шнаркевіч, Акінчыц, Бурсэвіч—абвіняюцца па арт. 110, 51 і 102 (ч. II) артыкулах К. К.

А. Луцкевіч прыдзелены да другое групы ў 44 асобы: Аляксандар Коўш, Уладыслаў Новакоўскі, Ян Кузьміч, Клаўдыя Гоцько, Мікалай Якімовіч, Вінцусь Шушкевіч, Язэп Баліцкі, Уладзімір Падбудзіка, Павал Драгун, Міхал Калпак, Ян Кот, Язэп Патапчук, Уладзімір Гмыр, Базыль Шкодзіч, Сьцяпан Шчыглінскі, Уладзімір Харкевіч, Стан.

Янкоўскі, Аляксандар Патоцкі, Ян Гелда, Аляксандар Зданюк, Павал Беламыз, Марцін Козіч, Сымон Саванец, Павал Якубчык, Сяргей Сіняк, Міхал Яхімовіч, Ігнат Шасько, Алякс. Марчык, Ант. Сакалоў, Міхал Нікіфароўскі, Канстанцін Лабуцька, Сьцяпан Стоцік, Канстанцін Сманіла, Міхал Шапель, Ян Варанковіч, Анатоль Даніловіч, vel Каляга, Алякс. Антановіч, Вінцусь Салыга, Вінцусь Крупіца і Ігнат Мармыш — якія абвінавачваюцца па 102 арт. часьць II К. К.

Сьцяпан Куліна-Куліноўскі абвінавачваецца па 109 арт. ч. II і III К. К.

Сьцяпан Казачонак, Міхал Кавалёў, Ніканор Каралевіч, Марк Каніковіч—абвінавачваюцца з арт. 102 ч. II, 49, 499, 51 і 455 К. К.

Цікава, чаму ў гэтым сьпіску няма б. пасла Сабалеўскага, які так дзіўна тлумачыўся на сельсаюзьніцкім зьезьдзе, што „ніякім здраднікам ён сябе ня лічыць?

Дзе яму да таго? Ен закідае сеткі на новыя ахвяры, якія яго павінны павясьці ў новы Сойм і якім потым ён... зноў ня здрадзіць...

Добрая краска ў Ярэмічавым „панскім“ букеце“, якраз туды й гадзіцца!

Як судзяць Грамадаўцаў. У восені 1926 г. быў арыштаваны сябра гуртка Бел. Сял.-Раб. Грамады ў Празароках Янка Балаш за антыпанствовую агітацыю на сходах гурткоў Грамады.

Акружны суд у Вільні засудзіў Янку Балаша на 4 гады катаргі. Але падсудны не згадзіўся з такім прысудам і падаў ў Апэляцыйны суд. І вось тут здарылася цікавая рэч, як кажа „Kur. Wil.“ (№ 7), асабліва цікавая ў зьвязку са зьбліжаючымся голасным працэсам Грамады.

Абаронца абвінавачанага адвакат Красоўскі паказывае на факт, што прылічэньне Балашу 126 арт. К. К., трактуючага аб недапушчальнасьці прыналежнасьці да арганізацыі, прызнанай дзяржавай за нелегальную ня можна абаснаваць, бо Грамада ня была ад самага свайго пачатку нелегальнай. Толькі пазьней яна была прызнанай за нелегальную. А дзеля таго, што Балаш належыў да Грамады тады, калі яна лічылася легальнай — выступленьні яго не падпадаюць пад пад артыкул 126, хіба ў найгоршым выпадку пад арт. 129 К. К.

Апэляцыйны суд прызнаў довады адваката і аднёс выступленьні Балаша да праступкаў, угледжаных у 129 арт. К. К. Але прызнаючы, што выступленьні Балаша былі вельмі вострыя і варожыя Польскай дзяржаве — вызначаную да гэтага часу Акружным Судом кару пакінуў ня зьмененай. Ня кіем, дык палкай!

15-гадавы юбілей прафэсіянальнага саюзу. Саюзганд.-прамысловых служачых сьвяткаваў 7 студзеня 15-гадовы юбілей свайго існаваньня. У салі „Макабі“ сабраліся прадстаўнікі розных арганізацыяў, прафэсыянальных саюзаў і палітычных партыяў і маса рабочых. Саля была перапоўнена. Прывітаньні і прамовы насілі ўрачысты характар. Асабліва горача былі прыняты прамовы прадстаўніка цэнтру і лявіцы ППС. Па жаданьню сабраньня аркестр шмат разоў іграў „Інтэрнацыянал“.

ППС супроць аб'яднаньня саюзаў. Некалькі тыдняў таму назад ППС-оўцы разьбілі будаўляны саюз, заснаваўшы падобны-ж саюз у сябе. Яны прымусілі шмат рабочых запісацца да іх, пагражаючы, што Чыж, які кіруе працамі, выкіне іх.

Добрыя ўчынкі ППС рабочыя адразу адчулі на сваіх плячох. У канцы сьнежня абвесьцілі рэдукцыю 135 рабочым. У абліччы гэтага страшэннага факту рабочыя сталі аслабленыя, з прычыны таго, што іх саюз быў разьбіты. Саюз з Вялікай вуліцы склікаў па пытаньню аб рэдукцыі супольны сход. На сходзе рабочыя выказаліся за злучэньне абодвых саюзаў, выбралі камісію па гэтаму пытаньню і прапанавалі з свайго боку прадстаўнікам ППС выбраць камісію.

На супольным сходзе 2-га саюзу адны з сяброў камісіі запрапанавалі злучыць абодва саюзы. Але сябра кіраўніцтва ППС-оўскага саюзу заявіў, што кіраўніцтва супроць злучэньня, і тыя, якія будуць галасаваць за гэтую прапанову, будуць выкінены з саюзу, (а рабочым даўно сказалі, што выкінутых з саюза пазбавяць працы). Такім чынам ППС-оўцы разьбілі саюз, а цяпер не даюць злучыць абедзьве яго часткі. Някепскія ўслугі аказваюць ППС буржуазіі ў прафэсіянальным руху.

Ці праўда гэта? Ходзяць упорлівыя чуткі, што творыцца яшчэ адзін выбарны сьпісак, на чале якога мае стаць вуч. з Наваградчыны М. Чатырка, а за плячымі яго яшчэ гучнейшыя імёньні. Ну, ніяк ня верыцца, каб М. Чатырка пашоў на разрыў з працоўнымі масамі, з якімі ён быў разам сколькі часу.

Што праўда, некаторыя адзнакі гавораць, што ён можа йсьці і проці масаў, а ішоў з імі—толькі ў лепшыя часы. Але—ці гэта-ж такі праўда аб новым сьпіску?

Далейшы развал Паўлюкевічаўшчыны. Выступ гр. М. Пятровіча проста агаломшыў Паўлюкевічаўскую банду. Вечны скарбнік — Вярнікоўскі бегае па Вільні ды крычыць: „Измена, потащил 1 600 сябров, совсем ничего не остаецца“.

Але па-за гэтым ідзе далейшы развал. Нядаўна вышла ў сьвет аднаднёўка „Выбух“, якая аказваецца выдана „б. людзьмі Паўлюкевіча“. Тут даволі ўдала характарызуецца ўся банда і яе атаман, як таксама і іх праца.

Толькі цікава, чаму гэта там Паўлюкевічу процістаўляецца нейкі Міткевіч з Баранавіч—ці ня новая канкурэнцыя „доктару“ поруч з Умястоўскім?

Чуткі аб развале яшчэ аднае выбарнае крамкі. Супрацоўнікі „Беларускага Дня“ скардзяцца, што к. Умястоўскі не выдае ім праз які ўжо час пэнсіі. У зьвязку з гэтым ходзяць паважныя чуткі, што „панок“ ня спраўдзіў надзеі большых паноў, і што яму... першаму задзержваецца пэнсія.

Вось цытрына—і нявыссаная выкідаецца! А можа пасьля гэтае заметкі—увальлюць „новыя сокі“? А варта было-б паддзяржаць гонар імя!

Гэта ім прыносіць шчасьце. Наша здрадніцкая прэса ня можа нахваліць уладу, якая на прадвыбарныя спэктаклі выдумала модны нумар... беларускую мову па радыё. Артыстам там зьяўляецца „надзейны“ на ўсе рукі, а асабліва ў Умястоўскага, А. З... ды яшчэ дзе хто лепшай масьці з ім разам! Раз модна—чаму ня крычаць „біс“? Гэта-ж такое шчасьце, чуць па радыё беларускую мову, на якой гавораць да тога...ну, ня самі паны, але ўсё-ж хоць іх лекаі!..

А яшчэ так брэшуць на Урад... А трэба толькі паказаць косьць, дык нашыя брахуны... і хвастом віляюць!

Ахвяры на карысьць пацярпеўшых ад стыхійных катастрофаў. Камітэт помачы ахвяр стых. катастрофаў атрымаў: ад сялян в. Кубельнікі, В. Эсьмантоўскай гм., Горадзенскага пав. наступныя ахвяры: ад Вас. Марцінчыка 5 зл.—ад Ів. Леванчука 3 зл. — ад Мік. Леванчука 3 зл.—ад Арсэна Леванчука 2 зл.—ад Мік. Арцёмчыка 1 зл. 50 гр. — ад Ул. Арцёмчыка 1 зл. — ад Кір. Арцёмчыка 1 зл.—ад Міх. Арцёмчыка 10 гр.

Усім ахвярадаўцам Камітэт прыносіць шчырую падзяку.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца Горадзенскага гуртка.

Дня 18-га сьнежня 1927 г. на падставе паведамленьня Горадзенскаму старасьце пісьмом нашым за № 6 адбыўся ўрачысты сход сяброў Горадзенскага гуртка з паводу першых угодкаў яго існаваньня, з наступным парадкам дня:

1) Рэфэрат аб адраджэньні беларускага народа.

2) Справаздача Управы Гуртка аб гадовай працы.

3) Арганізацыйныя справы.

4) Бягучыя справы.

На гэтым сходзе былі прыняты наступныя рэзалюцыі:

I. „Выслухаўшы даклад аб гадовай працы Горадзенскага Гуртка, сход канстатуе, што праца наагул вялася сумленна і добра, даўшы карысны рэзультат; драматычная сэкцыя працавала добра, паставіўшы 6 спэктакляў, з якіх адзін конкурсны, на якім здабылі 2 нагароду — дыплём; адчынена бібліятэка-чытальня; сэкцыі—музыкальныя і лекцыйныя працуюць слабей, чаму пажадана было-б, каб у гэтых сэкцыях палепшыць працу. Беручы пад увагу тое, што сябры Управы Горадзенскага Гуртка працавалі да гэтага часу сумленна і бескарысна на дабро агульнай справы, спатыкаючыся на кожным кроку з труднасьцямі, сход выносіць падзяку Управе Гуртка, пакідаючы стары склад, каторому даручаецца і надалей весьці грамадзкую справу гуртка“.

II. „18-XII 27 г. Горадзенскі Гурток Т-ва Бел. Школы сьвяткаваў дзень 1 гадаўшчыны свайго існаваньня, у гэты ўрачысты дзень агульны сход засылае прывітаньне сваім старшым таварышам, як сябрам Галоўнай Управы, так і тым, культурнікам, каторыя знаходзяцца сёньня за кратамі ў вастрогах, і заяўляем, што, усе, як адзін, будзем працаваць, не шкадуючы сваіх сілаў на здабыцьцё культурных правоў сваей Бацькаўшчыны.

Няхай жыве беларуская мова і культура.

Старшыня — Кізевіч
Сэкрэтар — Балдоўскі.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Бел. Школы ўневажняе білеты: № 393, выданы Акружн. Управаю на імя Мікалая Навіцкага з в. Пяшчанка па пастанове сходу Пяшчанскага гуртка Т-ва Б. Ш. за невыпаўнены § 12 ст. Т-ва. № 267 на імя Ганны Таранко з в. Лакно і № 269 на імя Сымона Бакаложка з в. Лакно па пастанове сходу Лакноўскага гуртка Т-ва Б. Ш. за невыпаўнены § 12 стат. Т-ва.

Уневажняецца білет № 739, выданы Галоўнаю Упр. Т-ва Б. Шк. на імя Міхала Барана з вёскі Рудавічы, Лашанскае гм., як згублены, а таксама білет № 2742 выд. Гал. Упр. на імя Янкі Барада з м Горадні і Кепко Самуіла № 6, як згублены.

Горадз. Акружн. Управа.

Пчаляры - Беларусы!

Даводзім да Вашага ведама, што пададзена просьба да Камісара Ураду аб дазволе склікаць на дзень 24-га студзеня, а гадзіне 3 й п. п. ў памешканьні Беларускага Каапэратыўнага Банку—Віленская вул. № 8, агульнага арганізацыйнага сходу Беларускага Каапэратыўнага Пчалярскага Т-ва, пад назовам „Пчала“.

Таварыства „Пчала“ будзе:

1) Купляць і прадаваць усе прылады і матэрыялы, неабходныя ў пчалярскай гаспадарцы.

2) Арганізоўваць перароблку і збыт пчалярскіх прадуктаў.

3) Арганізоўваць выстаўкі.

4) Закладаць навуковыя і дасьледчыя станцыі, прыкладныя пасекі, школкі расавае пчалы і плянтацыі мядовых расьцін.

5) Закладаць школы, бібліятэкі, чытальні і другія асьветна-ўзгадаваўчыя ўстановы.

6) Выдаваць пчалярскія часопісі і кніжкі, арганізоўваць курсы, лекцыі і г. д.—Гэта першая Беларуская Пчалярская арганізацыя ў Заходняй Беларусі.

Браты-Пчаляры! Усе, хто хоча падняць культурны ровень сваей пчалярскай гаспадаркі, пасьпяшыце прыняць удзел у арганізацыйным сходзе; пасьпяшыце запісацца ў сябры Т-ва.

Ініцыятыўная Група.

Паштовая скрынка.

Я. Дзяшкоўскаму ў Моўчадзі. Вы абураны на „Сял. Ніву“ за зьмяшчэньне карэспандэнцыі, бэсьцячай Вас, як чалавека, які меў якіясь супольныя нарады з агентам Умястоўскай фірмы — п. Цяўлоўскім з Баранавіч і Вы выклікаеце карэспандэнта (па Вашай думцы ён знаходзіцца ў Вільні, а не на вёсцы, як піша ў карэспандэнцыі) — каб ён меў грамадзкую адвагу сказаць сваё прозьвішча і падаць факты, чым Вы „дапамаглі п. Цяўлоўскаму ў яго бруднай юдашавай рабоце“.

Што „Сялянская Ніва“ займаецца нападамі з-за кута, як Вы пішаце, ды — скажам—яшчэ і даносіць куды трэба — у гэтым мы ўжо пераканаліся. Ей асабліва ненавісныя абаронцы інтарэсаў працоўных гушчаў. Што ж тычыцца адносінаў Вашых з Цяўлоўскім—радзім наагул дзяржацца далей ад падобных брудасаў і, калі Вы станеце на грунце абароны працоўных гушчаў — інсынуацыі буржуазнай газэты Вам ня будуць страшны. А то часамі ў зьвязку з гэтым думаюць, — што — „каля вады абмочышся“.

Батраку. Вы пішаце, што Вас, праваслаўных батракоў, змушае к. Лазінскі з м. Дунайчыцы, Нясьвіскага павету—працаваць у праваслаўныя сьвяты і гразіць у выпадку адказу замяніць „сваім“. Што паны лічаць нас за быдла і ня лічацца з тым, што для нас „сьвята“—гэта-ж вядома. Але будзьце пераконаны, што рэлігія тут—толькі прычэпка. І „свае“ батракі — яму таксама быдла. Дык змагайцеся супольна за палепшаньне свайго быту і за законны адпачынак?

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Як у нас праводзіцца асьвета.

У дзень 27/XII 1927 г. Гурток Т-ва Бел. Школы ў в. Літве, Палачанскае вол. Маладэчанскага павету адыграў п'есу: „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам“. П'еса гэта шмат уперад была падгатоўлена да пастаноўкі, але ўвесь час Гурток Т-ва спатыкаў перашкоды з боку адміністрацыі. Дзякуючы дапамозе Галоўнай Управы Т-ва, Гурток урэшце задаволіў усе вымаганьні Маладэчына. Старасты. У апошнія дні перад спэктаклем г. з. 25 і 26 сьнежня сябры Гуртка хадзілі на пошту, але кожны раз варочаліся з пустымі рукамі. Ясна, што, або зайшла нейкая памылка, або зроблена зумысная перашкода. Дык, каб высьвятліць справу, сябры Гуртка зьвярнуліся да войта, М. Пятровіча, які да іх вельмі прыхільна аднёсься і зараз-жа тэлефанаваў у пастарунак, каб даў высьвятленьні, што да рашэньня Староства у справе вечарыны. Аказалася, што дазвол знаходзіцца ў пастарунку, але не на 27/XII м. г., а на 29/XII м. г. Дзеля таго, што гэта супярэчыла выстаўленай даце ў просьбе да Старасты, войт быў змушаны перагаварыць справу з Старостам, каторае адказала, што гэта памылка і дазвол выданы на 27./XII. 1927 год.

Дзякуючы ўсім гэтым „адміністрацыйным памылкам“, сцэна ня зусім была адпаведнай для пастаноўкі, „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам“ і апрача таго, зайшоў пэўны непарадак, як вынік адсутнасьці артыстаў і г. д., бо да апошняга часу пастарунак паліцыі маўчаў аб дазволе. Ня гледзячы на тое, што народу было шмат, аднак гэта ня здолела затушаваць усе недахопы ў вечарыне, так-што атрымаўся дэфіцыт.

Адно толькі, трэба з радасьцю прызнаць, што, ня гледзячы на ўсе фармальнасьці, якія ставяцца з боку адміністрацыі пры ладжаньні вечарыны, не зважаючы на няўдачу папярэдняга спэктаклю, сябры Літоўскага Гуртка яшчэ з вялікшай энэргіяй і настойнасьцю вядуць сваю працу далей і кідаюць зерне за зернем на ніву беларускае культуры і асьветы.

Яшчэ пара слоў аб школьнай акцыі, чаго таксама ня можна прайсьці моўчкі. Калі сяляне в. Літвы у мінулым сьнежні 1927 г. зайшлі ў валасьць сьведчыць подпісы бацькоў на школьных дэклярацыях, дык праўда, войт М. Пятровіч без усялякіх перашкод стаў сьведчыць подпісы, але за тое гэтага-ж дня прыйшоў паліцыян з пастарунку ў Палачанах і амаль-што кожнага гаспадара аштрафаваў у суме ад 1 да 5 зл. А за што, спытайцеся? — Дык вось, за тое, што каля студні і на ходніках было крыху сьнегу ці лёду, (ясна як зімой). Дык справа тут ані ў сьнегу, ані ў лёдзе, — а ў дэкляраныях. Вось вам языковыя законы.

Вораг цемры.

Не кажэце гоп, пакуль не пераскочылі.

(В. Азіраўцы, Браслаўшчына).

Гонарысты паны Ярэміч і кумпанія, у сваей „Сялянскай Ніве“ з 7-I 28 г. пішуць:

„Паводле вестак, атрымліваных з вёсак у Сьвянцянскім выбарчым вокрузе, сялянскія масы найбольш цікавяцца блёкам нацыянальных меншасьцяў“.

Ня ведама, хто і адкуль дастаўляе ў рэдакцыю „Сялянскай Нівы“ гэтакія аптымістычныя весткі, бо ў нашым Браслаўскім павеце ніхто ня цікавіцца блёкам нацыянальных меншасьц. (Ярэмічавым конікам), акрамя, ну ведама, некалькіх „залежных“ людцоў з „інтэлігенцыі“. Нашыя сялянства ведае добра, што блёк нацыянальным меншасьцяў, як арганізацыя з буржуазнай ідэалёгіяй, нічога ня можа даць сялянству і работнікам, больш таго, што дала „Вызваленьне“. А дзеля таго, сялянства і работнікі Браслаўскага павету, а таксама, спадзяюся, сялянства і работнікі Сьвянцянскага, Пастаўскага і Дзісьненскага паветаў будуць галасаваць толькі за той сьпісак, які будзе прадстаўляць блёк усіх народнасьцяў з чыста клясовай сялянска-работніцкай ідэалёгіяй, або саўсім ня пойдуць на выбары.

Дык, паночкі Сельсаюзьнікі, не кажэце гоп, пакуль не пераскачылі, бо замест сесьці на пасольскі фатэль, каб часам ня селі-бы ў калёшу!

Падсьвінак.

Нашоў ратунак.

(В. Казлы, з Горадзеншчыны).

Ёсьць у нас польская школа, якая існуе прэйці год. Два гады ў ёй „вучыў“ нейкі Хваліск Шыміла, а цяпер прыслалі з Кракава нейкую вучыцельку. Вучэньне яе абмяжоўваецца загадам, каб добра выпалілі ў школе і яе кватэры. У часе заняткаў гэта вучыцелька „дэманструе“ сваю любоў перад сабачкай, якога перад дзяцьмі лашчыць, цалуець і гэтым канчаюцца яе заняткі.

А дзеці?

На гэта дасьць адказ наступны прыклад: мая дачка ходзіць у школу. Зацікавіўся я, як яна „цьвёрда“ ў навуцы. Ані чытаць, ані лічыць. Вось тут я ўбачыў, што дзіця дарма траціць час і рве абутак. Меншага хлопца я ў такую „навуку“ не аддаў, а купіў яму беларускіх лемантароў і стаў сам яго вучыць. Да каляд ён абмінуў сваю старшэйшую сястру ў чытаньні і арытмэтыцы.

Дык браткі, беларусы! Калі вы маеце дзяцей і жадаеце, каб яны ў „нашых“ польскіх школах ня былі накалечаны, не пашкадуйце некалькі грошаў і выпішаце для іх беларускіх лемантароў. Карысьць тут будзе большая, чым ад тэй школы, дзе дзеці дарма трацяць час.

Бацька-змагар за родную асьвету.

Рэдактар-Выдавец: М. Гэрмановіч.
Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.